ПРАВАВАЯ ІНІЦЫЯТЫВА

МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

# Калі на неба глядзіш праз краты

~~ДЕЛО №~~ ______

Турэмная паэзія беларускіх палітвязняў

Самвыд

да Тыдня супраць катаванняў

Прававая ініцыятыва, 2026

# Прадмова

Зборнік вершаў, які вы трымаеце ў руках, нарадзіўся там, дзе ў чалавека спрабуюць адабраць голас, годнасць і нават жыццё. Гэтыя вершы з'явіліся ў камерах, штрафных ізалятарах, турэмных шпіталях, на этапах, а яшчэ ў кароткіх прамежках паміжператрусамі, допытамі, забаронамі і чаканнем.

Толькі падумайце: гэтыя вершы нараджаліся ў свядомасці несправядліва асуджаных людзей у моманты, калі яны марылі вытрымаць хаця б яшчэ адзін дзень, не страціць унутраную апору і захаваць сабе. Таму мы ўпэўненыя, што кожны з гэтых вершаў – штосьці значна большае, чым проста тэкст.

Перад вамі – галасы самых розных людзей. Сярод іх есць журналіст_кі, паэт_кі, студэнт_кі, палітык_есы, актывіст_кі, бацькі, публічныя асобы, а таксама тыя, каго да арышту, акрамя сяброў і сваякоў, амаль ніхто і не ведаў. Але, нягледзячы на розны ўзрост, лёсы і гісторыі, кожнага з іх аб'ядноўвае досвед палітычнага зняволення і дзіўная сіла духу, якая дапамагае нават у самых цяжкіх абставінах не страціць здольнасць любіць, памятаць і верыць у лепшае.

А яшчэ ў гэтых вершах – родныя, якія чакалі лістоў; сябры, якія збіралі перадачы; адвакаты, якія спрабавалі захаваць хаця б мінімум сувязі са знешнім светам; людзі, якія не пераставалі называць вязняў паіменна. Гэтая кніга і пра іх таксама.

Ёсць тут і тое, чым жыве чалавек за кратамі: туга па дому, сум па дзецях, удзячнасць за ліст, размова з Богам і самім сабой, успышкі роспачы, упартасць надзеі, каханне, іронія, гнеў, святло... Камеры і калідоры, этапы і сцены, але ёсць і трава, дождж, яблыкі, птушкі, дзіцячыя галасы і будучыня, якую яшчэ давядзецца выбудоўваць нанова.

У сваёй працы мы часта размаўляем з былымі палітвязнямі і ведаем, што ў турме кожнае слова мае вагу. А яшчэ ведаем, што для многіх зняволеных вершы часам застаюцца адзінай формай свабоды, якую нельга адабраць да канца, пакуль чалавек здольны мысліць. Таму для нас гэты самвыдат – яшчэ і своеасаблівы сімвал супраціву знішчэнню чалавечай годнасці.

Выхад гэтага зборніка мы прысвяцілі нашай штогадовай інфакампаніі «Тыдню супраць катаванняў» – цыклу мерапрыемстваў, прымеркаваных да Міжнароднага дня ААН у падтрымку ахвяраў катаванняў.

І нам бы вельмі хацелася, каб гэты зборнік чыталі павольна. Не як паток тэкстаў, а як сустрэчу з кожным асобным чалавекам.

Магчыма, не ўсе сабраныя тут тэксты бездакорныя ў літаратурным сэнсе. Але патрабаваць ад турэмнай паэзіі бездакорнасці – значыць не разумець яе прыроды. Яе сіла не ў дасканаласці формы, а ў сэнсе таго, што ўтрымала чалавека на краі асабістай трагедыі.

Мы таксама не хочам, каб гэтыя вершы чыталіся як помнік прыжыццеваму пакутніцтву беларусаў. Для нас вершы ў гэтым зборніку – доказ незламанасці. І хоць у іх шмат болю, але есць і тое, што ў чалавека не здольная адабраць ніводная дыктатура: унутраная свабода, пачуцце ўласнай годнасці, вернасць любімым, здольнасць бачыць прыгажосць нават ва ўмовах прыніжэння і падаўлення асобы.

Калі гэты зборнік прымусіць хаця б аднаго свайго чытача запаволіцца і задумацца, што за кожным палітычна матываваным прысудам стаіць чалавечае жыцце, значыць, ен патрэбны. Калі ен дапаможа камусьці адчуць не жаль, а салідарнасць, значыць, гэтыя старонкі знайшлі свайго чытача.

Калі ж ён захавае хоць б частку гэтых галасоў для будучыні, у якой, мы ўпэўнены, давядзецца называць рэчы сваімі імёнамі і вяртаць кожнаму яго ці яе гісторыю, значыць, слова зноў выканала сваю працу.

# Андрэй Аляксандраў

Беларускі журналіст і медыяменеджар.

Быў затрыманы 12 студзеня 2021 г. супрацоўнікамі МУС.

15 студзеня ў афіцыйным паведамленні намеснік міністра ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь Генадзь Казакевіч заявіў, што Аляксандраў быў затрыманы “па падазрэнні ў фінансаванні пратэснай дзейнасці”.

Андрэя Аляксандрава абвінавацілі паводле шэрагу артыкулаў Крымінальнага кодэксу:

- ч. 2 арт. 342 (Арганізацыя групавых дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак і падрыхтоўка альбо навучанне такой дзейнасці);
- ч. 1 арт. 356 (Здрада дзяржаве);
- ч. 1 арт. 361-1 (Удзел у экстрэмісцкім фарміраванні);
- ч. 2 арт. 243 (Ухіленне ад выплаты падаткаў і збораў).

У Мінскім абласным судзе 6 кастрычніка 2022 года журналісту і медыяменеджару Андрэю Аляксандраву прызначылі 14 гадоў калоніі.

# Калі на неба глядзіш праз краты

Калі на неба глядзіш праз краты,не бачыш кратаў, а
бачыш неба.
Учорашні хлеб пахне цвіллю і стратай,
а заўтрашні пахне сапраўдным хлебам.

Ты кажаш: неба — падман аптычны.
Але падман — гэта краты, вер мне!
Бо краты — толькі хэштэг,
як звычка.

А гэты хэштэг зараз проста ў трэндах.
Ды справы няма да хэштэгаў небу,
пра трэнды неба зусім не ў курсе,
яно пад нагамі не чуе глебы,

не лічыць стагоддзяў і хлебных лустаў.
І неба цягне аблокаў вату
над часам — адзінае, што жыве.
І неба таксама не бачыць кратаў,
калі ўглядаецца ў неба ўва мне.

***



# "Валадарскі раманс, або Кантата экстрэміста

(На матыў песні Юзіка з Народнага альбому)"

Учора пілі мы замежныя віскі –
А сёння з табою мы экстрэмісты.
Ведае кожны сабака і мент,
што дэструктыўны я элемент.

Учора цябе запрасіў ў галерэю,
А сёння карцінна нары я грэю.
Да пабачэння, Суцін Хаім!
Учора стаялі – сёння сядзім.

Учора мы елі стэйкі ды манты,
а сёння сказалі: ўсё гэта за гранты!
Можа, не мАнты яны, а мантЫ!,
але ўсё роўна з табой нам кранты.

Учора чытаў пра дзяцей Аліндаркі –
Сёння чытаў пратакол Валадаркі.
Справу маю пракурор будзе шыць –
Трэба было экстрэмістам не быць!



Учора выконваў план пяцігодкі,
Сёння ўвайшоў у крымінальныя зводкі.
Пенсіянерка, дацэнт і студэнт –
хто лялькавод, а хто і агент.

І рэстаратары, і журналісты,
просты банкір і юрысты-флейтысты –
прадстаўнікі дэструктыўных мы сіл.
Нельга стабільнасць пускаць пад адхіл.

Распавядуць піянеры-гарністы,
быццам з табою мы экстрэмісты.
Злобна равуць на шырокі абсяг,
што экстрэмісцкі наш з табой сцяг.

Ды нагадаю вам факт барадаты:
сонца прыходзіць нават за краты!
Звонка прагоніць гарністаў лухцень
наш залацісты, ясны наш дзень!

І мы узнімем у дзень залацісты
сцяг наш любімы, неэкстрэмісцкі.
На пракурора знойдзецца мент –
скончым мы з нарамі эксперымент.

СВЯТЛО ПЕРАМОГІ

Вернем мы простых банкіраў у банкі,
Флейты – флейтыстам, рабочым – рубанкі.
Кніжку з законам абдыме юрыст.
Больш не агент я і не экстрэміст.

Радуйся, вёска! Танчы, сталіца!
Будзем з табой балявацъ-весяліцца.
Я прадказаць вам такое вазьмусь.
Дзякуй за ўвагу.
Жыве Беларусь!

***



# "У гэтай празрыстасці бачна, як дыхае горад..."

У гэтай празрыстасці бачна, як дыхае горад,
сцішана ў золата ўзняўшы мільёны вачэй.
Вочы чакаюць на знак, на збавіцеля подых.
Вочы спрабуюць забыцца, што будзе далей.

Бачна наскрозь, нам нібы адкачалі паветра
ды запалілі святло: усё бачна, глядзі!
Хто той збавіцель?
Ён – ты, які проста паверыў,
што у празрыстасці горада
ты не адзін.

МЫ РАЗАМ

"Зноў дваццаты. І зноў грамадзянская..."
Зноў дваццаты. І зноў грамадзянская,
І чырвоныя зноў на кані.
Мыем рукі. Трымаем дыстанцыю.
І трымаем свой парах сухім.

Чысцім чаты. Маўчым толькі стогнамі.
Крыж на памяць, як шнар, на далонь.
Двацца першы. На конях чырвоныя.
Тэмы разам драўляны іх конь.

Белы сцяг прыхаваем, не выкінем,
Не здаемся – ірвем на бінты.
Набрыняюць крыві нашай чырванню,
Прыдадуцца – у дваццаць другім.

Мыем рукі. Трымаем дыстанцыю,
Нас кароны не ўводзяць у зман,
Бо мы бачылі: на грамадзянскую
Нам хапае ўжо грамадзян.

***



# Ганна Аблаб

Супрацоўніца "Беларускай чыгункі".

Жанчына мае траіх дзяцей, двое з якіх — непаўнагадовыя.

Ганну затрымалі 22 верасня 2021 года.

Жанчына праходзіць па крымінальнай справе, распачатай паводле артыкулу аб здрадзе дзяржаве (ч. 1 арт. 356 Крымінальнага кодэксу) супраць супрацоўнікаў беларускіх заводаў, якія падтрымалі стачку і ўваходзілі ў "Рабочы рух". Гэтая ініцыятыва 21 верасня 2021 г. была прызнаная экстрэмісцкай, і адначасова па краіне прайшлі затрыманні рабочых.

Таксама ёй паставілі ў віну ч. 3 арт. 361-1 КК (удзел у экстрэмісцкім фармаванні). У Гомельскім абласным судзе 17 лютага 2023 г. вынеслі прысуд па "справе Рабочага Руху".

Суддзя Аляксандр Піскуноў прызнаў Ганну вінаватай паводле ч. 1 арт. 356 КК (здрада дзяржаве), ч. 3 арт. 361-1 КК (стварэнне экстрэмісцкага фармавання і ўдзел у ім) і прызначыў ёй 11 гадоў зняволення ў калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму.

# Любовь и Верность – два крыла

Любовь и Верность – два крыла
Могучих и неповторимых.
Судьба их в гости позвала –
Отведать сладостей любимых.

Они набрали высоту,
Над облаками им спокойно
И, созерцая красоту,
Летят уверенно, достойно...

Вдруг с неизведанных высот
Навстречу им летит планета,
Собой затмила небосвод,
Оставив Землю всю без света.

В тревоге Верность! И не зря –
К Земле стремглав летит комета!
Погибнет Матушка-Земля –
Тотчас – наступит конец Света!



Взмахнули разом два крыла
И землю крыльями закрыли.
Судьба-злодейка не смогла
Отнять у них, что так любили.

Однажды к нам приходит миг
Своё понять предназначенье
За жизнь любимых и родных,
И без раздумий, без сомненья.

В любви всегда смиренный вид,
Слова у Верности – не ветер!
Надежду Бог благословит
И мир на сказочной Планете.

***



# Дзмітрый Галко

Індывідуальны прадпрымальнік, бодзібілдар. Бронзавы прызёр чэмпіянату Беларусі-2019. Удзельнік Arnold Classic Europa-2019 (Men's Physique Master's).

Дзмітрыя затрымалі 21 кастрычніка 2020, пасля гэтага ён два дні знаходзіўся ў бальніцы.

Пры затрыманні яго моцна збілі і даставілі ў БХМД у аддзяленне спалучаных траўмаў: у Дзмітрыя была ЧМТ сярэдняй ступені цяжкасці і каля 50 udараў у адно месца ў вобласці правага сцягна.

Дмітрыя Галко абвінавацілі паводле артыкуле 364 Крымінальнага кодэкса ў тым, што ён ударыў відэакамеру супрацоўніка міліцыі, які, знаходзячыся пры выкананні, быў у грамадзянскай форме адзення і здымаў дваровы канцэрт. Таксама — у "абмежаванні свабоды пацярпелага і спробе двух udараў і пагроз".

Прысуд быў агучаны 6 студзеня 2021 года — тры гады пазбаўлення волі ў калоніі агульнага рэжыму. 9 жніўня 2023 г. палітвязень выйшаў на волю з ПК № 22, цалкам адбыўшы тэрмін зняволення.

Унылый день, табачный смог
Дверь, стертый каменный порог.
Затертый стол и тусклый свет
И здесь меня как будто нет.
Закрыл глаза, увидел дом
И я стою как будто в нем.
А рядом ты, выходишь словно с темноты
Идешь ко мне, идешь во свет
На свет, которого здесь нет.
Открыл глаза, опять туман
Какой-то дьявольский обман.
Вновь тусклый свет, поблекший цвет
И здесь меня как будто нет.
Закрыл глаза, и снова дом
И я опять как будто в нем.

***



# Андрэй Скурко

Кіраўнік аддзела рэкламы і маркетынгу "Нашай Нівы", аўтар часопіса "Наша гісторыя". З 2006 па 2017 быў галоўным рэдактарам выдання.

Андрэй быў затрыманы 8 ліпеня 2021 года і змешчаны ў ізалятар часовага ўтрымання на вул. Акрэсціна. Ён быў у статусе падазраванага па справе аб групавых дзеяннях, якія груба парушаюць грамадскі парадак (артыкул 342 Крымінальнага кодэксу).

Пасля 72 гадзін з моманту затрымання на волю яго не выпусцілі. 18 ліпеня 2021 года абраная мера ўтрымання ў выглядзе варты.

28 ліпеня 2021 года Андрэю Скурко прад’яўлена абвінавачванне па ч. 2 арт. 216 КК ("нанясенне маёмаснай шкоды без прыкметаў раскрадання, зробленае групай асобаў").

Прэтэнзія палягае ў тым, што аплата за камунальныя паслугі памяшкання была паводле тарыфаў для фізасобаў, а трэба было плаціць паводле тарыфаў для юрасобаў.

Следчыя налічылі, што за чатыры гады прадпрыемству "Мінэнерга" была нанесеная шкода ў памеры больш за 10 тысяч тысяч рублёў, якую абвінавачаныя кампенсавалі ў поўным аб'ёме.

Само прадпрыемства з прэтэнзіямі ніколі не звярталася.

15 сакавіка 2022 г. вынесены прысуд Андрэю Скурко. Суддзя Анжэла Касцюкевіч прысудзіла 2,5 гады пазбаўлення волі ў калоніі агульнага рэжыму.

18 жніўня 2023 г. палітвязень выйшаў на волю, цалкам адбыўшы тэрмін.

# Снежны кот

У мароз з лістом ад таты
Снежны кот бяжыць дахаты.
Плошчу, парк і плот высокі
Ён мінае за тры скокі.

Я сказаў яму на вушка
Для сыночка і дачушкі
Прывітанне перадаць,
Сон святочны паказаць.

***



# ЯКІЯ КВЕТКІ ЦВІТУЦЬ УЗІМКУ

Сцяў мароз лугі, палеткі.
Снег завеі рассцілаюць.
Але ёсць такія кветкі,
Што і ўзімку расцвітаюць.

Кветка шчырага сяброўства –
Калі сцюжаю зацятай
Зазірнем з ласункам простым
На гамонку пад гарбату.

Цемра. Завеюць не сціхае.
А любові цёплай краска
За сямейны стол збірае
Маму, тату, дзетак разам.

З кветак чуласці і ласкі,
Добрых спраў і мараў светлых
Трэюць самым зырочным часам
Шчасця сціплыя букеты.



***

# З НОВЫМ МЁДАМ!

Дзесь за горадам у лесе,
У чароўным гушчары,
Ёсць кавярня "Тры мядзведзі",
Дзе збіраюцца звяры.
І на Новы год, вядома,
Ім ніяк не ўседзець дома!
У меню – салаты, сокі.
У праграме – караоке!
Мікрафон – у крумкача:
"Мышы, совы, лосі, лісы,
Сёння ўсе вы – вакалісты!
Час ужо кар-цэрт пачаць!"
І гадзіннік поўнач б'е:
Пяць...
Чатыры...
Тры...
Але –
Не ўцярпеўшы, на калоду
Ускочыў мішка: "З Новым мёдам!"
Цераз лес ідзе цягнік –
зайцы едуць на пікнік!



Машыніст у іх — бабёр,
а варона — кантралёр.
Цягнічок «ту-ту!» спявае,
машыніст яго спыняе,
бо ля кожнае нары
іх надчэкваюць сябры.
Дзве лісіцы-праваднікі
раздаюць малечы піцу,
хамякі, мядзведзь і сойкі
паразвязвалі ссабойкі.
Хай сабе ідзе цягнік —
пачынаецца пікнік!

***



# Дзмітрый Канапелька

Дырэктар ААТ "Тэхнакратыя".

Быў затрыманы 11 верасня 2020 года за падзеі 9-12 жніўня ў Мінску. Ён у гэты час жыў у гатэлі "Вікторыя".

Яму было прад'яўленае абвінавачванне па ч. 1 арт. 13 і ч. 2 арт. 293 Крымінальнага кодэкса (падрыхтоўка да масавых беспарадкаў) і ч. 3 арт. 293 КК (іншая падрыхтоўка асоб да ўдзелу ў масавых беспарадках).

У судзе Маскоўскага раёна г. Мінска 10 чэрвеня 2021 г. агучылі прысуд: пакараць Дзмітрыя Канапельку па ч. 1 арт. 13 ч. 2 арт. 293 КК пазбаўленнем волі тэрмінам на 5 гадоў, а па ч. 3 арт. 293 КК - на 3 гады.

Канчаткова прызначыць пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам на 5 год ва ўмовах узмоцненнага рэжыму.

Па падліках выйшаў на волю 15 сакавіка 2025 г.

Я в лагере зимой сгребаю снег
А летом собираю пыль и подметаю лужи
Спасибо родине за заслуженный успех
Ведь за границей всё намного хуже.

***

Моя судьба невнятна как мычание немого
Сегодня на коне, а завтра в лагерях
То бизнесмен, плейбой и филантроп немного
То сумку в зубы, чтоб по этапу впопыхах.

***



# Арцём Задруцкі

Арцём Сяргеевіч Задруцкі быў затрыманы ў Брэсце па крымінальнай справе, распачатай за каментары ў інтэрнэце пасля гібелі супрацоўніка КДБ Дзмітрыя Федасюка і it-спецыяліста Андрэя Зельцэра.

Вядома, што Арцём праходзіў па крымінальнай справе паводле арт. 369 КК (Абраза прадстаўніка ўлады), арт. 130 КК (Распальванне сацыяльнай варожасці) і арт. 342 КК (Арганізацыя і падрыхтоўка дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак, або актыўны ўдзел у іх).

Да затрымання працаваў гукарэжысёрам, але ў зняволенні ў яго здарылася запаленне вуха: праз несвоечасовае лячэнне мужчына страціў слых на адно вуха.

Паводле інфармацыі праваабаронцаў, адбыўся разгляд справы, у выніку якога суддзя Мінскага гарадского суда Вера Галаўкова прызнала Арцёма вінаватым і асудзіла яго да трох гадоў зняволення ў калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму. Выйшаў на волю 30 снежня 2023 г.

# Стихотворение, написанное за решеткой.

Зима пронзает ветрами,
И холодом сводит с ума,
Тебя напрягает местами
Такая лютая зима.

Снегами в дороге закружит,
И бурей закроет в окне.
Лишь кубок грога нужен
В твоей замерзшей руке.

Пройдя лесами и полями
Свой долгий и холодный путь,
Зажечь в окнах огни
Для путников ты не забудь.

Быть может кому-то когда-то
В долгом холодно пути
Огонь твой зажженный однажды
Дорогу поможет найти.



***

# Уладзімір Гундар

актывіст і краязнаўца з Баранавічаў, мае інваліднасць другой групы (мужчына не мае нагі).

Яго затрымалі 30 снежня 2020 года па "справе Аўтуховіча" — нібыта за падрыхтоўку тэракту. Першы суд па крымінальнай справе над ім прайшоў у траўні 2021 года.

Яго абвінавацілі паводле арт. 366 (гвалт у дачыненні да службовай асобы). Брэсцкі абласны суд 20 траўня 2021 года асудзіў Гундара да трох гадоў калоніі агульнага рэжыму.

Разгляд "справы Аўтуховіча" распачаўся 18 траўня 2022 года ў СІЗА гродзенскай Турмы № 1. Суддзя — Максім Філатаў. Гундару інкрымінуюць ч. 1 арт. 285 КК (стварэнне злачыннай арганізацыі) і ч. 2 арт. 357 КК (замах на захоп дзяржаўнай улады неканстытуцыйным шляхам).

17 кастрычніка 2022 г. Гродзенскі абласны суд агучыў прысуд фігурантам справы. Суддзя Максім Філатаў прызначыў Гундару 18 гадоў калоніі ва ўмовах узмоцненага рэжыму.

17 красавіка 2023 г. суддзя Алена Пятрова прызнала палітвязня вінаватым у абразе пракурооркі Людмілы Герасіменкі, якая прадстаўляла абвінавачванне па "справе Аўтуховіча", і прызначыла Уладзіміру Гундару яшчэ два з паловай гады пазбаўлення волі — менавіта столькі і прасіла пракурорка Юлія Шчарбіна.

Шляхам частковага складання пакаранняў канчаткова Гундара асудзілі да 20 гадоў калоніі ва ўмовах узмоцненага рэжыму.

...Напярэдадні целагрэчку атрымаў —
Плоць маю яна сагравае.
На двары восень глыбокая —
Дні кароткія і цёмныя.
Восень глыбокая і ў душы,
Але душа не прымае цемры.
Надзеяй жыве душа —
Душа вясны чакае.
Любоў, надзея і вера
Саграваюць душу мне.

***



# Яўген Рубашка

Актывіст анархічнага руху, быў затрыманы 29 ліпеня 2021 года ў Мінску.

У яго кватэры прайшоў ператрус, пры затрыманні ён быў збіты.

22 красавіка 2022 года ў Мінскім абласным судзе вынесены прысуд палітзняволеным анархістам.

Суддзя Алена Міснік прызнала іх вінаватымі паводле ч.1 арт. 342 Крымінальнага кодэкса і ч. 3 арт. 361-1 Крымінальнага кодэкса і агучыла выракі Яўгену Рубашку — пяць гадоў пазбаўлення волі ў калоніі агульнага рэжыму.

Восенню 2025 г. стала вядома, што Яўгену дадалі 1 год пазбаўлення волі ў калоніі ва ўмовах строгага рэжыму паводле арт. 411 КК (злоснае непадпарадкаванне патрабаванням адміністрацыі).

Ты вялікі й магутны на пастаць
А з павагай у цябе абы як
Маю мяккасць прыняў ты за слабасць
Бо заўсёды быў цвёрды як знак
Я отравлен ядом империи
Она стала твоею тюрьмой
Пред тобой я виновен в неверии
В твое право остаться собой
Пакаленне за пакаленнем
Я тутэйшай заўсёды была
І шукала паразумення
І на твой алфавіт перайшла
Одиночества опасаясь
Дорожил я с тобою связью
Мне в ночи кошмаром являлись
Латиница вместе с вязью
Пазбаўляючы мяне гонару
Не дабавіш сабе ты ўласнага
Нялёгка прабачыць мне сораму
Называння мяне калгаснаю
В который раз власть похитили
Народных советов предатели
Мне заветами Солженицына
По капле рабство выдавливать.



***

Жнівеньскай спёкі аблічам
Перапраўленыя кантэксты
Стабільнасць на вуліцу кліча
БЧБ агульнапратэстны
З упартасцю непахіснай
Незалежнай Рэспублікі Мроі
Прыносілі сцяг анархісты
З салідарнасцю, нашай зброяй
Кансерватыўныя скрэпы
Пакрыўджаны рускім матам
Жанчына кахае жанчыну
П...а табе, патрыярхат
Без адпачынку ў выходныя
Мент адпрацоўваў паншчыну
У дварах традыцыяй годнай
Адраджалася партызаншчына
Мянушку сваю апазіцыя
Ты летам нарэшце страціла
Ёсць толькі адна пазіцыя:
Далой фашысцкую гадзіну!

***



# Дзмітрый Дубоўскі

Актывіст анархічнага руху, быў затрыманы пры пераходзе мяжы Беларусі ў ноч з 28 на 29 кастрычніка 2020 года.

Яго, а таксама Ігара Аліневіча, Дзмітрыя Рэзановіча і Сяргея Раманава, абвінавацілі па шэрагу артыкулаў за падпал службовых аўтамабіляў, будынка ДАІ і дзяржаўнага камітэта экспертыз у Гомельскай вобласці:

- ч. 2 арт. 289 — акт тэрарызму;
- ч. 2 і ч. 4 арт. 295 — незаконныя дзеянні ў дачыненні да агнястрэльнай зброі, боепрыпасаў і выбуховых рэчываў;
- ч. 1 арт. 333-1 — незаконнае перамяшчэнне праз мяжу забароненых рэчываў, агнястрэльнай зброі і выбуховых прыладаў.

У лютым 2021 года КДБ унёс палітвязня ў спіс "асобаў, датычных да тэрарыстычнай дзейнасці".

22 снежня 2021 года ў Мінскім абласным судзе быў вынесены прысуд фігурантам гэтай крымінальнай справы. Дзмітрый Дубоўскі атрымаў 18 гадоў калоніі ўзмоцненага рэжыму.

15 лістапада 2022 года ў судзе Заводскага раёна г. Мінска распачаўся суд над палітвязнем па справе аб падзеях 2009 і 2010 года ў Мінску і Салігорску. 25 лістапада яго прызналі вінаватым паводле ч. 2 арт. 339 КК (хуліганства) і ч. 2 арт. 218 КК (наўмыснае знішчэнне або пашкоджанне чужой маёмасці).

Суддзя Алег Каляда асудзіў Дзмітрыя да пяці гадоў пазбаўлення волі ў калоніі ўзмоцненага рэжыму.

Праз тое, што раней мужчыну ўжо асудзілі да 18 гадоў калоніі ўзмоцненага рэжыму, шляхам частковага складання пакаранняў, канчаткова Дзмітрыя Дубоўскага асудзілі да 20 гадоў пазбаўлення волі ў калоніі ўзмоцненага рэжыму.

О чем поет ночная птица
Одна в осенней тишине?
О том, с чем скоро разлучится
И будет видеть лишь во сне.
О том, что завтра в путь неблизкий,
Расправив крылья, полетит,
О том, что жизнь глупа без риска
И правда все же победит.
Ночные песни птицы вещей
Мне стали пищей для души.
Я понял вдруг простую вещь —
Мне будет трудно с ней проститься.
Холодным утром крик последний
Лишь бросит в сторону мою.
Ночной певец, я твой наследник, —
Лети, я песню допою.

***



# Віктар Лосік

быў затрыманы 6 снежня 2020 г. у п. Хацежына Мінскага р-на супрацоўнікамі МУС.

Яго абвінавачілі ў тым, што павесіў на мосце пудзілы з фотаздымкамі міністра ўнуртраных справаў і старшыні выбарчай камісіі Хацежанскага ўчастка для галасавання з надпісам “Не забудем, не простим!”, а таксама ў нанясенні выяваў з беларускім нацыянальным гербам “Пагоня” на збудаваннях і апорах маста.

Лосіка прызналі вінаватым паводле арт. 339, 341 Крымінальнага кодэксу і 19 красавіка 2021 года асудзілі да двух гадоў калоніі паводле ч.1 арт. 339, да чатырох гадоў калоніі — па ч. 2 арт. 339, да месяца арышту — па арт. 341.

У выніку праз паглынанне больш мяккага пакарання больш строгім Віктар Лосік асуджаны да чатырох гадоў пазбаўлення волі ў калоніі агульнага рэжыму.

Па падліках, мусіў выйсці на волю 10 верасня 2024 г.

Глядзеў сягоння я навіны,
Няўжо народ у нас наіўны?!
Прыехаў "сам" у Оршу... Пабач –
Стаіць міжволі поўны рогач!

Такі во цырк ужо кожны дзень
Глядзіць народ на драбядзень
Няўжо гатовы "есці" далей
Усю лухту, што ідзе "хваляй"?

А мо так трэба? Ці ўсе дурні...
Дык пасадзіце нас не ў турмы!
А ў дурдом, там такіх болей.
Ну... тых, каго пабачыў уволю.

Па СТВ, БТ, Расеі
Пакуль сяджу тут і "балдзею"
За што нам гэтая нягода?
Калі ўжо будзе нам лагода?

Час усё ідзе, ён у палацы.
А дзе мы ўсе? А мы ў сраццы!
І будзем доўга там, мы, мабыць.
Бо перспектыва гэтка вабіць.



Каго? Ябацьку, "кольку", хлопца,
Што са шчытом стаіць бясконца.
Каго яшчэ? Міністра, бабку,
Што зашывае латкай латку

Біятланістку, мэра, "саладуху",
Ад "песень" іх салодка вуху.
Усіх, чыё гарэзнае сумленне
Пакінула не на імгненне

А што да большасці астатніх?
Дык лепей ім садзець па хатах.
Баяцца – віруса, што прэ навокал
Вы пра кавід? Аб сінявокай...

Чым скончыцца? Вядома мне –
Мы так і будзем жыць "у гаўне"
Пакуль садзіць унутры "рабок"
Пакуль крэдыт, "зряплата" і савок.



Ці будзе лепей? Ну вядома!
І мы ўсе вернемся дадому!
Таму што праўда і сумленне
Сядзяць у нас не на імгненне!



***

# Кацярына Андрээва

Журналістка тэлеканала "Белсат".

Фігурантка крымінальнай справы аб арганізацыі дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак (арт. 342 Крымінальнага кодэкса), пасля прамога эфіру з месца жорсткага разгону сілавікамі дэманстрантаў на "Плошчы Пераменаў" у Мінску 15 лістапада 2020 г.

18 лютага 2021 года асуджаная на два гады пазбаўлення волі з накіраваннем у папраўчую калонію агульнага рэжыму.

7 красавіка 2022 года стала вядома, што журналістцы выстаўлена новае абвінавачванне — у "здрадзе дзяржаве" (ч. 1 арт. 356 Крымінальнага кодэксу).

Справу ў закрытым рэжыме 4 ліпеня 2022 пачаў разглядаць суддзя Гомельскага абласнога суду Алег Харошка. 13 ліпеня ён прызначыў Кацярыне 8 гадоў і 3 месяцы ў калоніі ва ўмовах узмоцненага рэжыму.

19 сакавіка 2026 г. у Мінск прыехаў з візітам Джон Коўл, спецпасланнік прэзідэнта ЗША Дональда Трампа.

У выніку перамоваў рэжым Лукашэнкі памілаваў 250 палітвязняў: 235 з іх былі вызваленыя ўнутры краіны, а 15 адправілі ў Літву. Сярод дэпартаваных— Кацярына Бахвалава (Андрэева).

Над белым полем — зімовым морам
У цішыні
І сярод турбот
Над маім шчасцем
І маім болем
Каторы месяц
Які ўжо год
Ляціць, трымціць
невымоўна ззяе
На чорнай коўдры
Родных нябёс
Мая самотная
І нямая
Мая адзіная
Зорка-лёс
Я ёй малюся, яе
Баюся
Яе спрабую
Не заўважаць
А прыйдзе час —
Назаўжды спынюся
Пад зорным позіркам
Спачываць.
Ужо не страшна
Ужо не смешна



Ужо ніякай няма бяды
У тым, што сціхлі
Навокал песні
А замест песняў —
Хрусцяць хработы.
У любым краі
Дзе на прадвесні
Ў вакно астрогу
Мне ззяеш Ты.

***



# Антаніна Канавалава

Яна была затрыманая 6 верасня 2020 г. і асуджаная ў адміністрацыйным парадку на 40 базавых велічынь штрафа за ўдзел у несанкцыянавым мерапрыемстве. Аднак пасля суду жанчыну не адпусцілі, а перазатрымалі ў межах крымінальнай справы.

Антаніна Канавалава знаходзілася ў статусе падазраванай паводле арт. 293 Крымінальнага кодэкса — "Масавыя беспарадкі".

7 траўня 2021 года ў Мінскім абласным судзе вынесены прысуды фігурантам справы па тэлеграм-канале "Армія з народам".

Антаніна Канавалава асуджаная да пяці з паловай гадоў пазбаўлення волі ў калоніі агульнага рэжыму.

Антаніна выйшла на волю 15 снежня 2024 г. па памілаванні.

# "Медведь живет в берлоге..."

Медведь живет в берлоге,
Собака – в конуре.
И очень-очень многие
Живут в своей норе.
Бобриный домик – хатка,
У филина – дупло,
Конюшня у лошадки
Там сухо и тепло.
И даже бабка-ежка
Имеет угол свой.
Избу на курьих ножках
С крылечком и трубой
А где живет Бабука?
Никто не замечал.
Она ко мне без стука
Приходит по ночам.
То шаркает чуть слышно,
То дверцами скрипит,
То занавеской дышит,
Пакетами шуршит.
Бабука, дорогая,
Иди к себе домой.



Прости, что я не знаю,
Какой он – домик твой.
А может быть ты тоже,
Не знаешь где пожить?
Так мы тебе поможем,
Давай с тобой дружить.
Мы выкопаем нору,
А сверху – конура.
А может будет впору
Гнездо как у орла.
Построю завтра утром
Я замок из песка.
Уйдет туда Бабука
И будет крепко спать.

***



# Ірына Шчасная

актывістка, рэдактарка папулярных тэлеграм-каналаў, сярод якіх "Мая краіна Беларусь".

Ірына была затрымана 18 лістапада 2020 года была супрацоўнікамі СК, якія былі пераапранутыя ў форму ЖЭС.

27 лістапада Ірыне было прад'яўлена абвінавачванне па ч. 1 арт. 13 і ч. 2 арт. 293 Крымінальнага кодэкса (падрыхтоўка да ўдзелу ў масавых беспарадках).

25 траўня 2021 года ў Магілёўскім абласным судзе  суддзя Ірына Ланчава асудзіла Ірыну Шчасную да 4 гадоў калоніі агульнага рэжыму.

Выйшла на волю 29 чэрвеня 2024 г.

# "Скрозь шэры вэлюм сівага туману..."

Скрозь шэры вэлюм сівага туману,
Праз веліч старажытных гушчароў,
Ласкавым рэхам л'ецца голас продкаў
– І сэрца чуе, памятае кроў.

А верхавіны дрэў кранаюць лісцям зоры,
Мядзведжай поўсцю сцеліцца імшар.
І хтосьці таямнічы, незнаёмы,
Мяне вядзе ў казачны абшар.

Там лесавік распавядае аб мінулым:
Пра волатаў і пра русалчын смех,
Пра цмокаў, што валодалі паветрам,
Пра тое, як з'явіўся чалавек

Мне ваўкалак спявае пра журбу – самоту,
Пра сумны лёс і пра нядбайны час
А я яго шалёна так кахаю –
Бо моманты гэты створаны для нас

Мацнее вогнішча сарод блакітнай хвоі,
Бурштынам ззяюць вочы пугача
Чароўны дотык аксамітнай ночы,
Ласкавых сноў хвіліны забыцца.

***



# Людміла Чэкіна

Былая генеральная дырэктарка TUT.BY. Працуе ў TUT.BY з 2008 года. Спачатку яна была юрысконсультам, а затым стала дырэктарам. У 2017 годзе Людміла ўзначаліла "ТУТ Бай медыя".

Людміла была затрыманая 18 траўня 2021 года ў межах крымінальнай справы, распачатай супраць TUT.BY за ўхіленне ад выплаты падаткаў у асабліва буйным памеры (ч. 2 арт. 243 Крымінальнага кодэксу).

Людмілу Чэкіну абвінавачвалі паводле трох артыкулаў Крымінальнага кодэксу:

- ч. 2 арт. 243 (ухіленне ад выплаты сумаў падаткаў, збораў у асабліва буйным памеры);
- ч. 4 арт. 16, ч. 3 арт. 130 (арганізацыя наўмысных дзеянняў, скіраваных на распальванне расавай, нацыянальнай, рэлігійнай альбо іншай сацыяльнай варожасці па прыкмеце расавай, нацыянальнай, рэлігійнай, моўнай ці іншай сацыяльнай прыналежнасці, якія ўчыненыя групай асобаў або пацягнулі цяжкія наступствы);
- ч. 4 арт. 16, ч. 3 арт. 361 (кіраўніцтва заклікамі да дзеянняў, скіраваных на нанясенне шкоды

нацыянальнай бяспецы Рэспублікі Беларусь, учыненае з выкарыстаннем сродкаў масавай інфармацыі або глабальнай камп’ютарнай сеткі Інтэрнэт).

9 студзеня 2023 г. у Мінскім гарадскім судзе пачаўся разгляд справы супраць найбуйнейшага беларускага незалежнага парталу TUT.BY.

Судовы працэс ад самага пачатку зрабілі закрытым.

17 сакавіка 2023 г. суддзя Валянціна Зянькевіч прызначыла былой галоўнай рэдактарцы парталу Марыне Золатавай і былой генеральнай дырэктарцы Людміле Чэкінай па 12 гадоў калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму кожнай.

# "Желтые стены, серый двор..."

Желтые стены, серый двор.
Можно годами ждать приговора.
Если два года – это не срок,
Путь до свободы слишком далек.
Шаг за шагом... В стену бег.
Крепче решеток наш человек.
Не плачь по мне, мама... Слезы утри.
Свобода – это то, что у нас внутри.

***



# Максім Знак

Адвакат, скончыў юрфак БДУ з адзнакай у 2004 годзе, пазней аспірантуру БДУ і абараніў навуковую дысертацыю на тэму "Дыспазітыўнасць дагаворнай адказнасці ў грамадзянскім праве" Затрыманы 9 верасня 2020 г.

Прад'яўленыя абвінавачванні:

- арт. 361 Крымінальнага кодэкса — Заклікі да дзеянняў, скіраваных на прычыненне шкоды нацыянальнай бяспецы Рэспублікі Беларусь
- арт. 357 Крымінальнага кодэкса — Змова з мэтай захопу ўлады неканстытуцыйным шляхам
- арт. 361-1 Крымінальнага кодэкса — Стварэнне экстрэмісцкага фармавання або ўдзел у ім

6 верасня 2021 года суддзя Мінскага абласнога суда Сяргей Епіхаў асудзіў Максіма да 10 гадоў пазбаўлення волі. Знаку прызначылі ўзмоцнены рэжым калоніі.

У Беларусі 13 снежня 2025 г. былі памілаваныя 123 чалавекі, у тым ліку палітвязні. Большасць памілаваных прымусова вывезлі на тэрыторыю Украіны:

туды дэпартавалі 114 чалавек, сярод іх 104 — беларусы, а таксама пяць грамадзян Украіны.

Памілаванне адбылося пасля перамоваў Лукашэнкі з амерыканскай дэлегацыяй на чале з Джонам Коўлам.

17 снежня палітзняволеных пачалі вывозіць з Украіны ў іншыя еўрапейскія краіны.

Кажуць што так здараецца... Так, так — здараецца,
Альбо лепей сказаць, можа здарыцца так,
Што калісьці, нарэшце, у нас — атрымаецца.
Тое, што не адбыцца не можа ніяк

Мы ж з маленства ўсе чулі, глядзелі, чыталі
Супраць праўды ніякага шанцу няма!

А хіба нам казалі, што «праўду» пісалі
Тыя, хто праз вайну дажылі да відна?!

«Гора вам!» — і ляціць ужо цяжар на шалі!
«Слава нам!» — і змяняе гісторыя шлях!
«Усе падман!» — нават праўда? А што? Не чакалі?
Усюды — зман... Безнадзейны... Суцэльны... Аднак...

Аднак, усё, усё бывае і так, што здараецца!
Што здараецца цуд — раз на вечнасць здараецца, так!
І калі нечаканасць чакання ўсё ж адбываецца,
Непапраўна ў гэтым угледваеш знак.

І пачнецца ізноў і ізноў — раз здараецца,
То ты мусіш змагацца і перамагаць.
Бо аднойчы — было, таму ўсё адно атрымаецца.
Бо калі немагчыма, то варта рабіць і чакаць.



***

# Алег Груздзіловіч

Журналіст «Радыё Свабода».

Быў затрыманы 16 ліпеня 2021 года падчас масавых вобшукаў у незалежных журналістаў у Мінску і іншых гарадах Беларусі. Праз 10 дзён яго вызвалілі. Пасля выхаду на волю журналіст распавёў, што застаецца падазраваным і даў падпіску пра яўку.

23 снежня 2021 людзі ў масках забралі Груздзіловіча з дому ў Мінску, выламалі дзверы. Алегу змянілі меру стрымання і ўзялі пад варту як падазраванага па крымінальнай справе "Арганізацыя і падрыхтоўка дзеянняў, што груба парушаюць грамадскі парадак, альбо актыўны ўдзел у іх" (арт. 342 КК).

16 лютага 2022 справу Алега перадалі ў суд. 2 сакавіка ў судзе Савецкага раёну Мінска распачаўся разгляд справы, пракурор запрасіў для журналіста 1,5 года зняволення ў калоніі агульнага рэжыму. Менавіта такі прысуд суддзя Сяргей Шаціла і вынес 3 сакавіка 2022 года.

21 верасня 2022 года стала вядома, што Груздзіловіч выйшаў на волю па памілаванні.

# За турэмным вакном

За турэмным вакном вые в'юга,
Вартавыя ад холаду курчацца,
Сто гадоў таму не было Google,
І няясна было, чым усё скончыцца.

Дзед садзеў ля каналу ў 20-х,
Як вярнуўса, зямлю адабралі,
А ў канцы крыватэрных 30-х
За размову ў чарзе расстралялі.

Мы ахвяры чарговага круга,
На такім жа жалезе мы курчымся,
Зразумела без усякага Google,
Што на нас гэта мусіць закончыцца.

***



# Уладзімір Гарох

Жыхар Навагрудку. Быў затрыманы 18 жніўня 2020 г. па так званай "Карэліцкай справе" — аб нібыта планаваных беспарадках у Карэлічах і Навагрудку пасля прэзідэнцкіх выбараў.

Уладзіміру Гароху было прад'яўлена абвінавачванне па ч. 1 арт. 293 Крымінальнага кодэкса — "Падрыхтоўка да масавых беспарадкаў". 29 снежня 2020 г. быў агучаны прысуд: Уладзіміру Гароху прысудзілі 6 гадоў і 6 месяцаў па ч. 1 арт. 293 і 1 год па арт. 368. Шляхам частковага складання канчатковае пакаранне склала 7 гадоў пазбаўлення волі ў калоніі ўзмоцненага рэжыму.

У Беларусі 13 снежня 2025 г. былі памілаваныя 123 чалавекі, у тым ліку палітвязні. Большасць памілаваных прымусова вывезлі на тэрыторыю Украіны: туды дэпартавалі 114 чалавек, сярод іх 104 — беларусы, а таксама пяць грамадзян Украіны.

Памілаванне адбылося пасля перамоваў Лукашэнкі з амерыканскай дэлегацыяй на чале з Джонам Коўлам. 17 снежня палітзняволеных пачалі вывозіць з Украіны ў іншыя еўрапейскія краіны.

# Любовь

Ты подошла к окну, обняв руками плечи
Взглянула вдаль, в мерцающий огнями небосвод
«Как жаль – сказала – что на этом свете ничто не вечно
Не вечен даже этот, звезд небесный хоровод

Так что же вечно может быть в земной юдоли?
Года летят как в небе метеоры
И все пройдет, увянет как трава в осеннем поле
Но хочется чтоб жизнь текла не так уж скоро»

Я подошел к тебе и прикоснувшись нежно,
Погладя мягко локоны волос
С улыбкой легкою и взглядом безмятежным
Ответил тихо, на волнующий вопрос:



«Любимая, пусть годы унесутся безвозвратно
И канет в прошлое событий череда
Мы все придем к судьбы своей закату
Но есть одно, что остается навсегда

Всегда живет – любовь, и нет ей окончанья
В любви сокрыто счастье, жизнь и свет
Любовь собою наполняет мирозданье
Она дороже миллиардов золотых монет

Не важно, сколько лет осталось за плечами
И сколько слез иль радости пришлось нам пережить
Нужно хранить любовь горящими сердцами
Ведь жизнь дана, чтоб быть любимым и любить.

***



# Максім Вінярскі

Актывіст грамадскай кампаніі “Еўрапейская Беларусь”. З’яўляецца прынцыповым і даўнім праціўнікам існуючага палітычнага рэжыму ў краіне.

За сваю выключна мірную апазіцыйную, публічную палітычную дзейнасць ён неаднаразова зазнаваў рэпрэсіі з боку дзеючай улады: штрафы, адміністратыўны арышт, збіццё, запалохванням і ціск.

22 студзеня 2021 быў затрыманы супрацоўнікамі ГУБАЗіК МУС. Знаходзіўся ў статусе падазраванага па ч. 2 арт. 13 і ч. 2 арт. 293 Крымінальнага кодэкса (падрыхтоўка да ўдзелу ў масавых беспарадках).

25 траўня 2021 г. у Магілёўскім абласным судзе абвясцілі прысуд па крымінальнай справе. Суддзя Ірына Ланчава асудзіла Максіма Вінярскага да 5 гадоў калоніі ўзмоцненага рэжыму

11 верасня 2025 г. стала вядома, што 52 вязня беларускага рэжыму прымусова

перамясцілі на тэрыторыю Літвы.

Сярод іх ёсць і грамадзяне еўрапейскіх краін.

У ліку вызваленых Максім Вінярскі.

Каб жыць, нам выпала цікавая часіна.
Калі прыйшоў яшчэ раз час світальны,
Шляхі нас прывялі да скрыжавання,
І кожны мусіць зараз шлях абраць.
Куды пайсці? Чаму жыццё аддаць?
Сябрам? Краіне? Ворагам? Свабодзе?
Таму, хто пры уладзе, мовіць: «Годзе!» –
Альбо, як «раб да веку», прамаўчаць?
Мы разам рушылі да зоркага святла.
Нас не спынілі кулі ды кайданы.
Мы не шкадуем пра свой шлях абраны,
Нават калі не выйдзем з небыцця.

***



## Сонца ўзыйдзе

А сонца – узыдзе,
нават калі навекі
лёс назаўжды самкне
апошнім вечным сном.
А сонца – узыдзе,
хаця ты кінеш зброю,
спыніўшы чын змагання,
забыўшыся на ўсё.
А сонца – узыдзе,
настане час світання.
І зерне прарасце,
раз кінутае яно.
Заззяе сонца нам,
разыдуцца аблокі,
і волі нашай час,
магчыма, надыдзе.
Калі не спынішся
ты сёння на дарозе
уласнага жыцця
насуперак нудзе...



***

# Алег Краўцоў

Былы фельчар хуткай дапамогі і прадавец у "5 элеменце".

У межах крымінальнай справы Краўцова затрымалі 4 лістапада прама на месцы працы ў "5 элеменце" за тое, што ён нібыта абкручваў дротам рэйкі на чыгунцы, каб заблакаваць рух цягнікоў.

Яму прад'явілі абвінавачванні ў актыўных дзеяннях, што груба парушаюць грамадскі парадак (ч. 1 арт. 342 КК) і наўмысным прывядзенні ў непрыгоднасць транспартнага сродку або шляхоў злучэння (ч. 1 арт. 309 КК).

Суддзя Максім Філатаў палічыў віну мужчыны даказанай і па двух артыкулах Крымінальнага кодэкса прызначыў яму пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам на 3 гады.

Алег Краўцоў выйшаў з ПК № 17 на волю 3 чэрвеня 2023 года, цалкам адбыўшы тэрмін.

# Я не вижу отсюда деревья

Я не вижу отсюда деревья,
Ни кусочка зелёной травы,
Ни цветочка, кусточка, растения —
Только серые стены тюрьмы.

Иногда вижу солнечный свет,
Резвых птиц под куполом неба.
Тёплый воздух лучами прогрет,
И следа не оставив от снега.

Я не знаю, как долго пробуду
В этой мрачной, холодной тюрьме.
Убеждён, мы все выйдем отсюда
Уже в новой свободной стране.

***



# Анатоль Хіневіч

Праграміст і бард з Барысава.

Суд Савецкага раёна 24 снежня 2020 года асудзіў яго да двух гадоў і шасці месяцаў пазбаўлення волі па ч. 2 арт. 363 Крымінальнага кодэкса за тое, што 20 верасня на "Маршы справядлівасці" наносіў супрацоўнікам АМАПа «ўдары лежачы».

Анатоль скончыў інстытут Сахарава БДУ, з 2014 па 2018 працаваў у КУП "Цэнтр інфармацыйных тэхналогій Мінгарвыканкама". Ён удзельнічаў у распрацоўцы афіцыйнага сэрвісу Мінгарвыканкама. На працы неаднаразова быў на дошцы гонару і атрымліваў граматы.

У родным Барысаве ведаюць Анатоля як барда і выканаўцу ўласных песень.

Палітвязень цалкам адбыў пакаранне і 15 лютага 2023 г. выйшаў на волю з ПК № 3.

# Незлічоных дзён

Колькі яшчэ патрабуецца дзён
чырвонавочаму хлопчыку,
каб зразумець, што ў палон
трапіў на землях паўночных.

Подых няволі змяшаўся з зямлёй,
у ей прарастае насеннем –
колькі яшчэ патрабуецца дзён,
каб знішчыць яго пакаленне?

Птушкі з-пад дротаў могуць ляцець,
іх крылы – транспарт да волі.
Ад кратаў, каб гадаваць дзяцей
без відаў жудаснай зброі.

Іх злічыць не адзін мільён
з вайны, дзе застаўся хлопчык,
колькі яшчэ патрабуецца дзён
да мірнай будучыні крочыць.

***



# Чалавеку дадзены шлях

Чалавеку дадзены шлях
і ўзняўшы дагары галаву,
калі трэба – залезе на дах
і адкажа: Так, я пайду.

Атрымаў гэты шлях ці другі,
хоць на поўдзень, хоць у гару,
пакачу да нябёс камяні,
не сказаўшы, што не, не пайду.

Па шляху ішоў многа год,
не жадаючы зла нікаму,
чалавек гэты не перамог,
бо ішоў не на вайну.

Чалавек дабрыню толькі нёс,
частаваў ёй сустрэчных людзей,
а яны, дазнаўшысь пра лёс,
зразумелі: так, ён пайдзе.



Чалавеку дадзены шлях
ён усюды, ён і нідзе,
а надзея гарыць у вачах,
што аднойчы ён усё-ткі дайдзе.



***

# Без краіны жаўнеры

Што ў вас у галаве,
без краіны жаўнеры?
У чарговай вайне
незразумелыя спевы,

дзеля якіх зямель,
супраць якіх народаў
кроў ап'яніла, не хмель,
што пралілась з натоўпа?



Міру мяжу не знайсці
без краіны жаўнерам –
у кожным першым тыцці
белыя плямы цемры.

Белыя плямы краін
на акрываўленай мапе.
Зброяй жаўнеры саклі
у звар'яцелым жаxе.

Скончылісь усюль тыхары,
засталісь толькі жаўнеры
са зброямі і без краін,
у помніках заржавелых.

***

# Уладзімір Булаўскі

Віцебскі актывіст і культурны мэнэджар.

Першы раз ён быў затрыманы ў асноўны дзень галасавання на рэферэндуме, 27 лютага 2022 г., і арыштаваны на 15 сутак. Уладзімір мусіў выйсці на волю, але дадому яго прывезлі пяць сілавікоў, зладзіліператрус і зноў забралі актывіста з сабой.

Другі раз яго затрымалі пасля таго, як 14 снежня 2022 г. у Віцебску былі затрыманыя яшчэ трое асобаў, якія, як і Уладзімір Булаўскі, звязаныя з дзейнасцю гастрапаба ROK'I PUB.

Вядома, што падчас знаходжання ў СІЗА-2 у мужчыны памёр бацька, але адміністрацыя не адпусціла Уладзіміра на пахаванне.

У выніку супраць віцебскага арт-менеджара распачалі крымінальную справу паводле арт. 342 КК.

26 траўня 2023 г. Уладзіміру Булаўскаму прысудзілі два гады калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму.

На судзе Уладзімір не прызнаў віну і даваў паказанні на беларускай мове.

Палітвязень не абскарджваў прысуд і быў этапаваны ў ПК № 2 для адбыцця пакарання. 23 чэрвеня 2023 г. МУС унесла палітвязня ў "спіс экстрэмістаў".

Выйшаў на волю 1 лістапада 2024 г.

# Рэчка

Калі ты на Дзвіне карабель, то рыхтуйся:
парогі, дамбы, парты і на мель.

Лягчэй быць цеплаходам простым —
ад плошчы да парка, назад, і бог з імі.

Яшчэ можна катамаранам па Віцьбе —
пакарысталіся, далёка не заплылі
і да берага на зіму выцягнулі.

А калісьці ў дзяцінстве мы каталіся на крыгах —
ад сярэдзіны і дамоў, было небяспечна.

— Эй, малы, збірайся. Пагналі на рэчку.

***



# Лічбы

"Паглядзеў на захад сонца" —
і трымай пятнаццаць сутак.
Здай прынесеныя кнігі,
паліто і свой абутак.

Здай сваіх сяброў і гонар,
здай каханне і Радзіму.
І таварышу маёру
ўсе светлыя здай успаміны.



Атрымаеш ты "баланду" —
тройчы ўдзень цераз "кармушку".
Атрымай сырую "вату"
і дзіравую падушку.

На шаснаццаці квадратах
будзеш восьмым арыштантам.
Дзве на тыдзень перадачы
атрымай — і будзеш рады.

Чвэрць гадзіны на памыцца
раз на тыдзень пад халоднай.
Па чатыры цыгарэты
ўраз паліць — ужо не шкодна.

Кожны сон твой — пра свабоду,
пра каханую і лета.
Кожны дзень спрабуеш успомніць
подых веснавога ветру.

Палічы — мільён і трыста —
вольным стаць нарэшце мусіш.
Здзейсняцца, нібыта мроі,
сны аб новай Беларусі!

***



# Той, хто застаўся

Твае дахі мяне спакушаюць
схадзіць на іх і застацца.
Паглядзець на зоры і агні места,
адчуць, як тут цесна.

Твае масты запрашаюць
залезці над іх,
праверыць, ці можна стаяць.
Ці рака не знясе нас,
як 300 гадоў назад.

Твае людзі глядзяць на цябе,
як на нерухомасць.
Хаця ты — найлепшы гросмайстар
з тых, хто застаўся.

***



# Пасля

Міма працягнутая рука.
Развярнуўся і пайшоў
у адваротным напрамку.
Прабач, мне маякнулі:
табе лепей тут не з'яўляцца.

Я думаю, як бы Разанаў
напісаў пра гэта верлібр,
Бахарэвіч — эсэ,
а Шакунова эмоцыі
выдаляла б з верша.

***



# Мікіта Найдзёнаў

Беларускі паэт і музыка, былы фронтмен гурту Hurma, а таксама аўтар шэрагу песень розных артыстаў. У 2015 стаў уладальнікам прэміі «Залаты апостраф» у намінацыі «Дэбют» за найлепшую публікацыю вершаў у часопісе «Дзеяслоў».

Праваабаронцы атрымалі інфармацыю, што ён знаходзіцца ў СІЗА Жодзіна ўжо як мінімум з канца красавіка. Папярэдне, яму інкрымінаваны «народны» арт. 342 КК — за ўдзел у паслявыбарчых пратэстах.

У ліпені 2023 г. быў пераведзены з Следчай турмы № 8 у СІЗА-1.

Справу Мікіты будуць разглядаць 19 ліпеня 2023 г. у судзе Ленінскага раёна Мінска. Працэс будзе весці суддзя Марына Клімчук. Асуджаны на 3 гады "хатняй "хіміі".

Мікіта быў вызвалены з-пад варты ў зале суда.

22 верасня 2023 г. МУС унесла Мікіту ў "спіс экстрэмістаў".

У той час, калі людзі ў космасе
абжываюцца дзень за днём,
арастанты турмы нумар восем
хлеб пілуюць канём.

І працуюць законы фізікі
на арбіце і на зямлі.
Ніткай рэжучы, можна высекчы
іскры, крошкі і мазалі.



Знітаванья супярэчліва
дом з парэнчамі, сад з парэчкамі
і каманда "на выхад з рэчамі",
што дарэчна хоць сто разоў.

Чысты дух і хімічныя рэчывы,
з чалавечым — сярэднявечнае,
паслязаўтрашняе — з адвечным
у абдымку ляцяць да зор.

І як спроба пакінуць мецінi
для наступнага светлага дня —
у няспынным і зменлівым свеце
арастанты пляцуць каня.

***

# Турэмны гамбіт

Дзіцячы мат. За тры хады
зліў партыю. У чыстую.
Раней гуляў гады ў рады,
а тут штодня вучуся я.

Настрой згубіў на цэлы дзень,
маўчаў, садзеў як шахнуты.
І ў бок той блізка не глядзеў,
дзе шапацелі шахматы.

Ферзя — узяў і праміргаў
за пешкамі няспешнымі.
А раз ільга — ён прамільгаў:
шах, мат — і ўсё завершана.

Удар трымаў і лёс прымаў
і бачу як на сканеры,
што мат дзіцячы атрымаў
у дзвесці шостай камеры.

***



Усё будзе добра!

Прававаая ініцыятыва, 2026